ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ, ПРАФКОМА І МЯСЦКОМА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 23 (156) | Субота, 23 чэрвеня 1973 г. | Год выдання 4-ты | Цана 2 кап.

## У ДОБРЫ ШЛЯХ, ВЫПУСКНІКІ ГДУ!

Заканчваецца чэрвень. Надыходзіць самы хвалюючы дзень для тых, хто заканчвае універсітэт. Гэта — дзень, калі будзе атрыман дыплом аб вышэйшай адукацыі, і сэрца кожнага напоўніцца вялікай радасцю. Гэта—дзень, калі адчуваецца і пачуццё суму, бо давядзецца, развітвацца з усім тым, што на працягу ўсіх гадоў вучобы было блізкім і дарагім — з сябрамі і педагогамі, з вучэбнымі карпусамі і інтэрнатамі, а для большасці выпускнікоў яшчэ і з нашым цудоўным горадам Гомелем.

Цяпер мы звяртаемся да вас, дарагія выпускнікі з самымі шчырымі словамі і пажаданнямі. Кожны з вас выходзіць на працоўны шлях. Адны прыйдуць у школы, другія — на прадпрыемствы, трэція — у лабараторыі і г. д. Але дзе б вы не працавалі, у горадзе ці ў вёсцы, усюды і заўсёды высока трымайце марку і даражыце гонарам нашага універсітэта, дзе атрымалі вышэйшую адукацыю! З поўнай аддачай прымяняйце свае веды на практыцы, уносьце дастойны ўклад у пабудову камуністычнага грамадства і выхаванне падрастаючага пакалення ў духу лепшых традыцый савецкага народа.

За гады вучобы многія з вас набылі грамадскія прафесіі. Не забывайце пра іх. З першых крокаў самастойнай працы будзьце сапраўднымі актывістамі, ініцыятарамі і арганізатарамі карысных спраў. Усёй сваёй дзейнасцю старайцеся заслужыць аўтарытэт і павагу таварышаў, усіх тых, з кім будзеце працаваць побач.

Шчаслівага шляху вам, дарагія выпускнікі!

**РЭКТАРАТ, ПАРТКОМ, КАМІТЭТ ЛКСМБ, ПРАФКОМ.**



## ПОСПЕХУ ВАМ, ДАРАГІЯ ВЫХАВАЦЕЛІ!

**Валянціна САХАРНІКАВА,**
**выпускніца механіка-матэматычнага факультэта.**

Празвінеў апошні званок, і мы, выпускнікі, адчулі, што наступіў час развітання з таварышамі па вучобе, з захапляючым і напружаным студэнцкім жыццём, любімымі выкладчыкамі.

Наш пяты курс мехмата з удзячнасцю будзе памятаць сваіх настаўнікаў, строгіх экзаменатараў, але добрых і адзычлівых старэйшых таварышаў, якія заўсёды дапамагалі нам сваёй парадай, па-бацькоўску клапаціліся аб моладзі. Шчыра жадаю ўсім ім вялікага чалавечага шчасця, моцнага здароўя, добрага настрою і поспехаў у навуковай дзейнасці!



## САМЫЯ ЦЁПЛЫЯ ЎРАЖАННІ

**Канстанцін АНАНЧЫКАЎ,**
**выпускнік фізічнага факультэта.**

На мінулым тыдні я абараніў дыпломную работу. Гэта быў вынік маёй пяцігадовай вучобы ва універсітэце. Скажу шчыра, што радасць вялікая. Яна зразумелая кожнаму, хто быў студэнтам.

Прадстаіць развітанне з ГДУ. З асаблівай цеплынёй я буду ўспамінаць сваіх выкладчыкаў Эдуарда Міхайлавіча Інспектарава, Уладзіміра Мікалаевіча Старыкава, Пятра Уладзіміравіча Сурыкава, усіх, хто шчодра перадаваў моладзі свае веды.

Ва універсітэце я сустрэў сваё каханне. У нас расце цудоўны сын Саша, якому ўжо паўтара года. Еду працаваць па размеркаванню ў Рагачоўскі раён, і ў час развітання я шчыра дзякую родны універсітэт за ўсё добрае, што тут атрымаў.



## ЗБЫЛАСЯ ЮНАЦКАЯ МАРА

**Вячаслаў КОСАЧ,**
**выпускнік завочнага аддзялення біёлага-глебавага факультэта.**

З дзяцінства мяне цягнула да птушак і звяроў. Хацелася пабольш даведацца аб кожным з іх. І вось цяпер здзейснілася мая юнацкая мара—лепш вывучыць акаляючы жывёльны свет.

Я працую ў таварыстве аховы прыроды. Пазнаць сваю работу мне дапамаглі універсітэцкія выкладчыкі. Шмат сваіх ведаў і энергіі перадалі нам, студэнтам-завочнікам, доктар біялагічных навук, прафесар Ігар Васільевіч Жаркоў, дацэнты Панцеляймон Паўлавіч Грыгор'еў, Ніна Сямёнаўна Кісялёва і Анісім Рыгоравіч Шабалін, кандыдат біялагічных навук Леанід Міхайлавіч Сапегін і іншыя. Усім ім студэнты-завочнікі выказваюць вялікае і шчырае дзякуй.

## ЗА НАРОДНЫХ ВЫБРАННІКАЎ



Дзень выбараў у мясцовыя Саветы, якія праводзіліся ў мінулую нядзелю, стаў сапраўдным святам і для шматтысячнага калектыву нашага універсітэта.

Арганізавана, на высокім палітычным узроўні прайшлі выбары на выбарчых участках № 11 і № 13, якія размяшчаліся ў нашым універсітэце.

На выбарчым участку № 11 у ліку першых прагаласаваў Мікалай Мікітавіч Меняйлаў. Ён — камандзір экіпажа самалёта АН-24. У нядзелю Мікалаю Мікітавічу прадстаяў рэйс у Сухумі, і перад вылетам ён з пачуццём вялікага задавальнення за Айчыну, яе народ, за дастойных выбраннікаў у кіруючыя органы Савецкай улады апусціў у ўрну бюлетэні.

На выбарчым участку № 13 да чатырох гадзін дня прагаласавалі ўсе выбаршчыкі. Не на многа пазней закончылася галасаванне і на выбарчым участку № 11.

Дзень выбараў яшчэ раз засведчыў высокую актыўнасць савецкіх людзей, цесную згуртаванасць іх вакол Камуністычнай партыі і Савецкага ўрада.

**На здымку:** на выбарчым участку.

## У ІНТАРЭСАХ МІРУ І БЯСПЕКІ НАРОДАЎ

Людзям XX стагоддзя давялося перажыць шмат пакутаў, якія прынесла чалавецтву вайна.

Кожны свядомы грамадзянін планеты Зямля з вялікай увагай сочыць за візітам Генеральнага сакратаре ЦК КПСС Л. І. Брэжнева ў ЗША, бо ведае, што сустрэчы кіраўнікоў дзвюх буйнейшых дзяржаў будуць спрыяць аслабленню міжнароднай напружанасці паслужаць справе міру.

Чалавецтва з надзеяй глядзіць на нашу краіну — фарпост міру. Сустрэчы Леаніда Ільіча Брэжнева з Рычардам Ніксанам паслужаць умацаванню аўтарытэта нашай Радзімы, яе міралюбівай палітыцы, стануць новым этапам у развіцці савецка-амерыканскіх адносін.

**С. КАРЖОЎ,**
**Р. МАРГОЛІН,**
**удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, — студэнты-завочнікі гісторыка-філалагічнага факультэта.**

* * *

Мір...

Якое кароткае, але такое ёмкае і дарагое слова. Мір, спакойнае блакітнае неба над галавой патрэбны і школьніку, што рыхтуецца ўступіць у жыццё, і сівому ветэрану. Мір патрэбен усім людзям зямлі.

Сёлета я заканчваю універсітэт, і самае маё вялікае жаданне, каб выбухі бомб ніколі не перапынілі маіх школьных урокаў, каб у міры і спакоі расла мая маленькая дачка. Таму я з такой увагай і хваляваннем сачу за візітам добрай волі ў Злучаныя Штаты Амерыкі Леаніда Ільіча Брэжнева і ад усяго сэрца жадаю яму поспехаў у перагаворах і шчаслівага вяртання ў Маскву.

**Н. ШАБАН,**
**Коласаўская стыпендыятка.**



На гэтым здымку — выпускнікі фізічнага факультэта. Ва ўсіх іх цяпер выдатны настрой. Яшчэ б! Большасць маладых спецыялістаў, якіх вы бачыце, на выдатна абаранілі дыпломныя работы, атрымаюць дыпломы с адзнакай.

У першым радзе (злева направа): Ніна Пашынская, Аляксандр Бялянкін, Раіса Ганчарэнка, Валянціна Брынцава; у другім радзе — Дзмітрый Белы, Васілій Яўменаў, Анна Прышчэпава; у трэцім — Алег Палій, Іван Рудзінскі, Міхаіл Спрэсаў, Міхаіл Прупес.

Фота А. Рудчанкі.

# ЗАЎТРА — ДЗЕНЬ САВЕЦКАЙ МОЛАДЗІ

## ЗАГАРТАВАНЫ НА СЛАЎНЫХ ТРАДЫЦЫЯХ

Кожны год у апошнюю нядзелю чэрвеня ў нашай краіне адзначаецца Дзень савецкай моладзі. Гэта — вялікае свята маладога пакалення Краіны Саветаў. Яно выліваецца ў яркую дэманстрацыю сапраўднага шчасця юнакоў і дзяўчат нашай Радзімы, іх вялікай адданасці справе, за якую змагаўся правадыр і настаўнік усіх працоўных свету Уладзімір Ільіч Ленін — справе камунізму.

Моладзь — вялікая стваральная сіла савецкага грамадства. Разам з усім савецкім народам юнакі і дзяўчаты працуюць цяпер ва ўсіх галінах гаспадаркі — у прамысловасці і сельскай гаспадарцы, на транспарце і новабудоўлях, у навуковых і культурна-асветных установах і г. д. Яны актыўна ўдзельнічаюць у грамадскім жыцці, у кіраванні краінай.

Камуністычная партыя і ўвесь савецкі народ па праву ганарацца нашай моладдзю. За гады Савецкай улады на яе рахунку нямала гераічных здзяйсненняў. Залатымі літарамі ў гісторыю ўпісаны подзвіг маладых патрыётаў на палях бітваў супраць ворагаў нашай Радзімы і на франтах мірнай стваральнай працы.

Маладыя воіны і цяпер настойліва авалодваюць навейшай зброяй, ваеннай тэхнікай, надзейна ахоўваюць свяшчэнныя рубяжы любімай Айчыны, гатовы ў любую мінуту нанесці сакрушальны ўдар па агрэсарах.

Наша моладзь, яе баявы авангард — камсамол ідзе ў першых шарэнгах будаўнікоў камуністычнага грамадства. Любы заклік партыі заўсёды знаходзіць гарачы аднадушны водгук юнакоў і дзяўчат, якія поўныя рашучасці на выкананне самай складанай і адказнай задачы.

Цяпер камсамольскія арганізацыі лічаць сваёй пачэснай справай барацьбу за ўмацаванне эканамічнай магутнасці Радзімы, павышэнне эфектыўнасці вытворчасці, паскарэнне развіцця навукова-тэхнічнага прагрэсу. Усюды мы бачым моладзь на пярэднім краі, там, дзе цяжэй. Сёлета яе баявым дэвізам стаў заклік: «Ударнай працай і выдатнай вучобай азнамянуем трэці, рашаючы год дзевятай пяцігодкі!». Камсамольскія арганізацыі ўзялі на сябе павышаныя сацыялістычныя абавязацельствы і з поўнай аддачай сіл змагаюцца за іх выкананне. У Дзень савецкай моладзі яны будуць рапартаваць аб усіх тых дасягненнях, якія здзейснены на ўдарнай вахце сёлетняга года.

З пачуццём вялікай гордасці за нашу неабсяжную шматнацыянальную Айчыну адзначаць свята студэнты і маладыя супрацоўнікі нашага універсітэта. Гэты дзень яны сустракаюць дастойна. Заканчваецца летняя экзаменацыйная сесія, якую большасць студэнтаў вытрымала паспяхова. Парадавалі і выпускнікі. На дзяржаўных экзаменах яны паказалі трывалыя веды, і хутка будуць прымяняць іх на практыцы ў розных галінах народнай гаспадаркі.

Больш арганізавана, чым у папярэднія гады, прайшоў падрыхтоўчы перыяд да трэцяга, працоўнага семестра. У ім прыме ўдзел звыш 650 студэнтаў, якім прадстаіць асвоіць 950 тысяч рублёў капіталаўкладанняў. Байцы СБА выедуць на важнейшыя аб'екты Гомельшчыны, дапамогуць убіраць ураджай гародніны братняй Малдавіі.

Ва універсітэце паспяхова праходзіць здача норм новага комплексу ГПА. Як ніколі раней, сталі масавымі спартыўныя старты.

Самааддананай працай і старраннай вучобай, усімі сваімі справамі савецкая моладзь дэманструе непахісную вернасць камуністычным ідэалам, мацуе супрацоўніцтва з сіламі міру і прагрэсу, дамагаецца стварэння адзінага фронту моладзі ў барацьбе за мір, дэмакратыю, незалежнасць, раўнапраўства ўсіх народаў планеты.

Са святам вас, маладыя!

**Т. ІЛЬЯНКОВА,**
**сакратар камітэта камсамола.**



**Алег Макееў заканчвае трэці курс факультэта фізічнага выхавання. Ён добра вучыцца, актыўна займаецца ў студэнцкім навуковым таварыстве.**

**На здымку: А. Макееў праводзіць дослед.**

## ГАРАЧЫЯ ДНІ ФЕСТЫВАЛЮ

Заўтра ўся савецкая моладзь выйдзе на сваё свята. На фінішы Усесаюзнага фестывалю прыемна падвесці вынікі работы і нам, членам Клуба Інтэрнацыянальнай Дружбы універсітэта.

Наш Клуб нарадзіўся ў перыяд фестывалю савецкай моладзі, які праводзіўся з мэтай дзейснай падрыхтоўкі да Х Сусветнага фестывалю студэнтаў і моладзі.

З першых дзён мы пачалі карпатлівую работу па ўстанаўленню сувязей з КІДамі вышэйшых навучальных устаноў краіны, па прапагандзе сусветнага форуму моладзі, які адбудзецца ў Берліне. Наладжаны кантакты з Днепрапятроўскім і Чарнаўцкім дзяржаўнымі універсітэтамі, з Чарнігаўскім педагагічным інстытутам і іншымі ВНУ. Вядзём мы перапіску і з Камітэтам маладзёжных арганізацый Савецкага Саюза.

Намі афармлен маляўнічы стэнд «Фестываль крочыць па краіне», для нагляднай агітацыі ва універсітэце развешана нямала плакатаў аб фестывалі. Па хвалюючых моладзь пытаннях у нашым Клубе можна атрымаць самую разнастайную інфармацыю, асабліва аб міжнародным маладзёжным руху, аб прадстаячым Х фестывалі.

У канцы красавіка ва універсітэце гасціла дэлегацыя Сацыялістычнага Саюза Моладзі з сяброўскай Паўднёва Чэшскай вобласці. Мы дзяліліся думкамі аб падрыхтоўцы да Берлінскага фестывалю, даведаліся многа новага аб жыцці моладзі нашых брацкіх краін. Сувязі нашага універсітэта з Паўднёва-Чэшскай вобласцю сталі даволі трывалымі. У дні Х Сусветнага фестывалю моладзі і студэнтаў у Берліне будзе працаваць інтэрнацыянальны атрад ГДУ «Дружба» ў горадзе Чэске-Будэйовіцэ.

Заканчваецца фестываль савецкай моладзі. Напярэдадзе — вельмі цікавы міжнародны маладзёжны форум, многа новых сустрэч, новай цікавай работы.

**І. НЯМКЕВІЧ,**
**прэзідэнт Клуба Інтэрнацыянальнай Дружбы ГДУ.**

*Да 70-годдзя II з'езда РСДРП*

## ВАЖНАЯ ВЯХА Ў ГІСТОРЫІ

НАБЛІЖАЕЦЦА 70-годдзе з дня адкрыцця II з'езда РСДРП, які з'явіўся важнай вяхой у гісторыі камуністычнай партыі. З'езд аформіў стварэнне РСДРП.

Пралетарская партыя бальшавікоў была ўтворана ў Расіі на ідэйна-палітычных і арганізацыйных прынцыпах, якія былі распрацаваны У. І. Леніным.

На працягу многіх гадоў, з пачатку 90-х гадоў мінулага стагоддзя. У. І. Ленін выступаў як верны паслядоўнік вучэння К. Маркса і Ф. Энгельса, творча развіваў марксізм у новых гістарычных умовах, разгарнуў жорсткую барацьбу супраць розных ворагаў марксізму, супраць усякіх праяў апартунізму ў рабочым руху, за арганізацыю і ўмацаванне сіл пралетарыяту пад знакам рэвалюцыйнага марксізму.

Пад кіраўніцтвам сваёй партыі расійскі пралетарыят выходзіў на палітычную арэну як самы рэвалюцыйны ў свеце, і гэта тлумачылася тымі гістарычнымі ўмовамі Расіі. «...Нам, — гаварыў У. І. Ленін, — абсалютна чужая думка лічыць рускі пралетарыят выбраным рэвалюцыйным пралетарыятам сярод рабочых іншых краін... Не асобныя якасці, а толькі выключна склаўшыеся гістарычныя ўмовы зрабілі пралетарыят Расіі, застрэльшчыкам рэвалюцыйнага пралетарыяту ўсяго свету». (У. І. Ленін, ПЗТ, т. 31, стар. 91).

У пачатку XX стагоддзя Расія была цэнтрам імперыялістычных супярэчнасцей. Абвастрэнне гэтых супярэчнасцей прывяло ў Расіі да нарастання рэвалюцыйнай барацьбы. Выступленне ў 1901 годзе рабочых Абухаўскага завода ў Пецярбургу, у лістападзе 1902 года ў Растове-на-Доне прайшла агульная забастоўка, аб якой У. І. Ленін гаварыў, што пралетарыят Расіі «ўпершыню праціпастаўляе сябе як клас усім астатнім класам і царскаму ўраду» (У. І. Ленін, ПЗТ, т. 9, стар. 251).

Летам 1903 года поўдзень Расіі быў ахоплен стачкай, у якой прымала ўдзел 100 тысяч чалавек .Гэта стачка па ўзроўню арганізаванасці, вытрыманасці і настойлівасці рабочых прадстаўляла сабой выдатную падзею не толькі ў расійскім, але і ў сусветным рабочым руху.

Аналізуючы ўздым рэвалюцыйнага рабочага руху ў Расіі ў 1901—1903 гадах, У. І. Ленін зрабіў прынцыпова важны вывад аб тым, што на змену палітычнай рэакцыі прыйшоў перыяд палітычных узрушэнняў і рэвалюцый.

Наступленне новай эпохі нарадзіла і якасна новую сапраўдную рэвалюцыйную пралетарскую партыю. Яе арганізатарам быў У. І. Ленін. Творча распрацоўваючы і развіваючы тэорыю марксізму, У. І. Ленін усебакова ўлічваў як новую стадыю развіцця сусветнага капіталізму — імперыялізм, так і асаблівасці яго праяўлення ў Расіі. Гэта дало яму магчымасць вызначыць шляхі будаўніцтва рэвалюцыйнай пралетарскай партыі і спосабы яе барацьбы ў новых гістарычных умовах. Тое новае, што ўнёс У. І. Ленін у рэвалюцыйную тэорыю, узбагаціла ўвесь сусветны рабочы рух, узняла марксізм на новую ступень. «Ленінізм, —гаворыцца ў тэзісах ЦК КПСС да 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна, — гэта марксізм эпохі імперыялізму і пралетарскіх рэвалюцый, эпохі крушэння каланіялізму і перамогі нацыянальна-вызваленчых рухаў, эпохі пераходу чалавецтва ад капіталізму да сацыялізму і будаўніцтва камуністычнага грамадства».

У. І. Ленін прыйшоў ужо ў 90-х гадах да вываду аб тым, што ў Расіі нават пры наяўнасці царызму ёсць неабходныя перадумовы для стварэння самастойнай партыі рабочага класа. У гэты перыяд адбываецца пераход расійскай сацыял-дэмакратыі ад прапаганды марксізму да яго практычнага спалучэння з рабочым рухам. Першым буйным крокам у рашэнні гэтай задачы з'явілася аб'яднанне восенню 1895 года разрозненных марксісцкіх гурткоў і груп Пецярбуга ў «Саюз барацьбы за вызваленне рабочага класа».

Усебакова ўлічваючы вопыт заходнееўрапейскага і расійскага рэвалюцыйнага руху, У. І. Ленін у 1894—1904 гадах распрацаваў тэарэтычныя, праграмныя, палітычныя і арганізацыйныя асновы пралетарскай партыі новага тыпу, партыі бальшавікоў. У гэты ж перыяд Леніным быў абгрунтаван план стварэння партыі. Вялікую ролю ў гэтым адыграла агульнаруская палітычная газета — ленінская «Искра», якая пачала выходзіць у 1900 годзе.

У выніку дзейнасці «Искры» былі распрацаваны Праграма і Статут партыі, распрацаваны асновы палітычнай стратэгіі і тактыкі пралетарскай партыі, якая толькі нараджалася.

К вясне 1903 года пад уздзеяннем ленінскай «Искры» і кнігі «Што рабіць?» большая частка сацыял-дэмакратычных арганізацый на месцах прыняла паслядоўна іскраўскую лінію. «Искра» стала цэнтрам падрыхтоўкі ідэйнага і арганізацыйнага згуртавання сацыял-дэмакратычных арганізацый. Ствараліся ўмовы для склікання II з'езда Расійскай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі.

II з'езд РСДРП працаваў з 17(30) ліпеня па 10(23) жніўня 1903 года. Сваю работу з'езд пачаў у Бруселі, а затым у сувязі з паліцэйскімі праследаваннямі пераехаў у Лондан. На з'ездзе былі прадстаўлены 26 арганізацый. Вялікую работу У. І. Ленін праводзіў з дэлегатамі з'езда, якія прыбывалі з Расіі. Ён беспамылкова вызначыў палітычныя групоўкі і дакладна прадстаўляў непазбежнасць упартай барацьбы на з'ездзе за марксісцкія прынцыпы пралетарскай партыі, за перамогу іскраўскага напрамку.

Важнейшай справай з'езда было прыняцце Праграмы РСДРП. Праект Праграмы быў распрацаван рэдакцыяй «Искры» і апублікаван больш чым за год да з'езда.

Прыняццё з'ездам Праграмы партыі, яе Статут, шэраг рэзалюцый па тактычных пытаннях, стварэнне цэнтральных устаноў дазволілі расійскаму пралетарыяту вызваліцца ад

# ПАКУЛЬ НЕ ДАПІСАНЫ ПРАТАКОЛЫ

Выстаўлены адзнакі, узгоднена думка членаў камісіі — закончыўся дзяржаўны экзамен па навуковаму камунізму ў студэнтаў-завочнікаў факультэта фізічнага выхавання. Сакратар дзяржаўнай камісіі ўпісвае ў ведамасць канчатковыя адзнакі... Аб чым яны расказваюць? Ніхто не будзе аспрэчваць, што студэнтам завочнага аддзялення вучыцца складаней, і, натуральна, сярэдні бал у іх меншы, чым на стацыянары. Але ў завочнікаў ёсць і значная перавага — багаты практычны вопыт.

Сярод 79 выпускнікоў-завочнікаў — 42 настаўнікі, 16 трэнераў, 23 інструктары і аргработнікі. У кожнага вялікі стаж. Яны сваімі адказамі даказалі, што добра засвоілі універсітэцкі курс. І экзаменатар кандыдат гістарычных навук Э. Энцін, і члены дзяржаўнай камісіі з задавальненнем слухалі чоткія, лагічныя адказы І. Кудласевіча, В. Жараўца, Б. Гасіча, А. Панкрацьева, Н. Калацэя.

У параўнанні з мінулым годам павысіліся веды выпускнікоў па навуковаму камунізму. На 10 працэнтаў узрасла колькасць выдатных адзнак, а сярэдні бал цяпер складае 3,96.

Але побач са станоўчым, неабходна сказаць аб слабых адказах Н. Сарокі, П. Дзедзікава, К. Вазновіча, якія недобрасумленна падрыхтаваліся да дзяржаўнага экзамена.

Сярод вучэбных груп лепшыя вынікі ў першай. Сярэдні бал тут 4,44. Яе выпускнікоў вызначае настойлівасць, дысцыплінаванасць і мэтанакіраванасць. Яны рэгулярна наведвалі лекцыі і кансультацыі. І, як сведчыць факт, колькасць перайшла ў якасць.

На экзамене па тэорыі фізічнага выхавання і педагогіцы трывалыя веды паказалі В. Ачкурэнка, Ул. Куцін, Д. Крывец, В. Жараўня, заслужаны трэнер Беларускай ССР, майстар спорту Р. Казоўскі, майстар спорту міжнароднага класа, чэмпіён Савецкага Саюза Я. Гаўрыленка. Усе яны здалі на выдатна два дзяржэкзамены.

Яшчэ не дапісаны пратаколы дзяржаўнай экзаменацыйнай камісіі. Выпускнікоў-завочнікаў чакаюць апошнія выпрабаванні. Хочацца спадзявацца, што яны іх вытрымаюць.

**Я. ВІЛЬКІН,**
**старшыня ДЭК завочнага аддзялення факультэта фізічнага выхавання, кандыдат гістарычных навук, дацэнт.**



На дзяржэкзамене адказвае завочнік Міхаіл Катляроў.

## ДЗЁННІК СЕСІІ

### НАШЫ ІНТЭРВ'Ю

**Наш карэспандэнт сустрэўся з намеснікам дэкана механіка-матэматычнага факультэта Неанілай Міхайлаўнай Пакаташкінай. Іх гутарка была прысвечана будням летняй экзаменацыйнай сесіі.**

**Ніжэй мы друкуем інтэрв'ю з Н. М. Пакаташкінай.**

**— Як Вашы выхаванцы сустрэлі сесію!**

— Да летняй экзаменацыйнай сесіі студэнты прыйшлі падрыхтаванымі — свое часова здалі ўсе залікі.

**— Зараз сесія дасягнула свайго экватара. Якую з груп вы маглі б адзначыць, хто з студэнтаў паказвае прыклад?**

— Нядрэнна пачалі сесію ў 22 групе. Другакурснікі здалі два прадметы — фізіку і філасофію. Нездавальняючых адзнак у іх няма. Па дзве пяцёркі атрымалі Т. Гаўрыленка і С. Гуз.

М. Яськова. На жаль, тут сваіх таварышаў падводзіць Я. Эпштэйн. У яго ўжо дзве нездавальняючыя адзнакі — па фізіцы і тэорыі функцый комплекснага пераменнага. Пры такім «старанні» ў вучобе Якаву пагражае развітанне з універсітэтам.

**— А як абстаяць справы ў першакурснікаў?**

— Асабліва непакоіць дэканат становішча ў 11 групе. На экзамене па аналітычнай геаметрыі і лінейнай алгебры з 27 чалавек восем атрымалі двойкі. Сярод «вызначыўшыхся» Л. Бяздольная, Л. Бібікава і В. Трухан. Яны і на зімовай сесіі паказалі далёка не бліскучыя веды, мелі па дзве двойкі. Як бачна, урокі першага семестра не паслужылі для Бяздольнай, Бібікавай і Труханы трывожным папярэджаннем.

# ПАСЛЯ ТРОХ ЭКЗАМЕНАЎ

Хочацца адзначыць 35 групу. Яе студэнты добра сябе зарэкамендавалі на экзаменах па палітычнай эканоміі, замежнай мове і тэорыі функцый комплекснага пераменнага. Здалі іх без двоек. На тры выдатныя адзнакі атрымалі Л. Дзятлава і Р. Калеснікава.

У 35 групе тры экзамены на выдатна здалі І. Курбыка, Я. Кавалёў, Л. Ліпскі і

# І РАДАСЦІ, І НЯЎДАЧЫ

На летняй экзаменацыйнай сесіі студэнтам другога курса нашага факультэта прадстаіць здаваць апошні раздзел агульнай фізікі — оптыку. У яго ўваходзяць хвалевая і геаметрычная оптыка, узаемадзеянне святла з рэчывамі.

Што ж паказваюць экзамены?

Першай свае веды ў вывучэнні оптыкі дэманстравала 25 група. Па адказах было бачна, што студэнты нядрэнна папрацавалі на працягу семестра. Прыемна было слухаць Якава Фірэра, Віктара Мацькунова і Ігара Аструна, якія далі вычарпальныя адказы на пытанні білетаў і справіліся з дадатковымі. Гэтыя юнакі заслужана атрымалі пяцёркі.

Цвёрдымі ведамі парадавалі мяне Анатоль Маслаў, Алена Каралькова і Уладзімір Пячора. Уся група здала экзамен без двоек.

У 24 групе грунтоўнымі ведамі вызначыліся Сяргей Курловіч, Сяргей Лаўрыненка і Анатоль Вайцянкоў, якія адказалі на выдатна.

Сумленна адносяцца да сваіх студэнцкіх абавязкаў будучыя фізікі Аляксандр Саракавых і Алег Палееў. Яны здалі экзамен на чацвёркі.

У параўнанні з мінулым годам 24 група зрабіла ў вучобе значныя зрухі ў лепшы бок. Але, на жаль, на экзамене па фізіцы тры чалавекі — Валянціна Карацэвіч, Анатоль Гаеў і Пётр Марозаў — атрымалі нездавальняючыя адзнакі.

**Ул. АНТРОПАЎ,**
**загадчык кафедры агульнай фізікі, в. а. дацэнта.**

# КУРСАВЫЯ АБАРОНЕНЫ

Значнай падзеяй у жыцці студэнтаў другога курса эканамічнага факультэта была абарона курсавых работ. Гэта своеасаблівы экзамен, праверка ведаў, умення і навыкаў, набытых у выніку карпатлівай працы па збору і апрацоўцы вялікай колькасці тэкставага і лічбавага матэрыялаў.

Курсавыя работы абараняла 155 чалавек. 147 з іх атрымалі добрыя і выдатныя адзнакі. Гэта сведчыць аб тым, што будучыя спецыялісты добрасумленна вывучалі першакрыніцы твораў К. Маркса, Ф. Энгельса, У. І. Леніна, важнейшыя матэрыялы і дакументы партыйных з'ездаў і міжнароднай Нарады прадстаўнікоў камуністычных і рабочых партый, у якіх адлюстраваны злабадзённыя праблемы палітычнай эканоміі, значны матэрыял студэнты чэрпалі з аналізу дзейнасці прамысловых прадпрыемстваў Гомеля. Большасць тэм прысвечана вывучэнню надзённых народна - гаспадарчых праблем: выраўніванню ўзроўней эканамічнага развіцця асобных раёнаў СССР у працэсе сацыялістычнага будаўніцтва, росту эфектыўнасці і інтэнсіфікацыі вытворчасці, паглыбленню развіцця эканамічнай рэформы, удасканаленню планавання і кіравання вытворчасцю і інш.

Асаблівую ўвагу студэнты ўдзялілі крытыцы буржуазных, рэфармісцкіх і рэвізіяніцкіх канцэпцый сацыялізму.

Глыбокія па зместу, навукова абгрунтаваныя, добра аформленыя работы прадставілі на абарону Алена Лявоненка, Рыгор Грыб, Наталля Мільчанка, Алена Ком і іншыя студэнты.

У параўнанні з мінулым годам навуковы ўзровень курсавых работ стаў значна вышэй.

**Т. КАЛЕНІКАВА,**
**загадчыца кабінета палітычнай эканоміі.**

# КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ

традыцый разброду, распуснасці, аб'яднаць разам дзесяткі гурткоў і груп, якія гатовыя былі адмовіцца ад сваёй былой самастойнасці ў карысць вялікага, упершыню на справе ствараемага цэлага — партыі (т. 8, стар. 401).

Прынцыповае адрозненне новай партыі расійскага пралетарыяту ад партыі II Інтэрнацыянала састаіць у тым, што на II з'ездзе РСДРП яна прыняла сапраўды рэвалюцыйную праграму, адным з патрабаванняў якой было ўстанаўленне дыктатуры пралетарыяту.

У. І. Леніну і іншым цвёрдым іскраўцам у жорсткай барацьбе ўдалося адстаяць патрабаванне дыктатуры пралетарыяту. У першай Праграме РСДРП было чотка запісана, што неабходная ўмова сацыялістычнай рэвалюцыі «складае дыктатура пралетарыяту, г. зн. заваяванне пралетарыятам такой палітычнай улады, якая дазволіць яму падавіць усякае супраціўленне эксплуататараў». Гэта была вялікая перамога рэвалюцыйных марксістаў на чале з У. І. Леніным над рускім і міжнародным апартунізмам.

Праграма РСДРП сведчыла аб высокім узроўні развіцця тэарэтычнай думкі расійскіх марксістаў. Гэта была праграма рэвалюцыйнай барацьбы з капіталізмам, а не праграма рэформ. У Праграме ўтрымліваліся фармуліроўкі асноўных дэмакратычных і сацыялістычных задач, яна клікала масы да барацьбы за рэвалюцыйнае пераўтварэнне грамадства на сацыялістычных пачатках.

Важнае прынцыповае значэнне мела барацьба партыі на з'ездзе па нацыянальнаму пытанню. Праграма патрабавала поўнага раўнапраўя нацый і права нацый на самавызначэнне. Патрабаванні Праграмы клікалі працоўных прыгнечаных нацыянальнасцей Расіі на барацьбу разам з рускім пралетарыятам супраць царызму, які праводзіў палітыку вялікарускага нацыяналізму.

Большая частка дэлегатаў з'езда дружна процістаяла праявам буржуазнага нацыяналізму і паслядоўна адстойвала прынцып пралетарскага інтэрнацыяналізму. На гэтым сапраўды марксісцкім прынцыпе партыя расійскага пралетарыяту з моманту ўзнікнення аб'ядноўвала рабочых розных нацый. Пад яе кіраўніцтвам будаваліся па інтэрнацыянальнаму прынцыпу прафсаюзы, кааператывы, культурныя ўстановы і іншыя арганізацыі рабочага класа. Рэвалюцыйная Праграма партыі, прынятая II з'ездам, вызначала як бліжэйшыя задачы пралетарыяту на этапе буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі, так і асноўныя яго задачы, якія вырашаюцца перамогай сацыялістычнай рэвалюцыі.

Прыняцце Праграмы знаменавала сабой перамогу іскраўскага напрамку ў РСДРП, перамогу рэвалюцыйнага марксізму над кіраўніцтвам «эканамістаў», якая мела вялікае значэнне не толькі для рускага, але і ўсяго міжнароднага рабочага руху. Гэта была Праграма рабочай партыі, якая ўвабрала ў сябе вялікія ідэі «Маніфеста камуністычнай партыі» К. Маркса і Ф. Энгельса.

Пасля прыняцця Праграмы з'езд перайшоў да абмеркавання Статута партыі. Галоўная арганізацыйная ідэя, распрацаваная ленінскай «Искрой», заключалася ў тым, што партыя павінна быць арганізацыяй з цвёрдай пралетарскай дысцыплінай, маналітнай у барацьбе, якая накіроўвае і кантралюе дзейнасць кожнага члена партыі. У праекце Статута, прапанаваным У. І. Леніным, указвалася, што членам РСДРП лічыцца ўсякі, які прыме яе праграму і падтрымлівае партыю як матэрыяльнымі сродкамі, так і асабістым удзелам у адной з партыйных арганізацый. У. І. Ленін лічыў, што ў партыю павінны прымацца людзі дастойныя, здольныя самааддана змагацца за справу рабочага класа, весці штодзённую будзённую работу ў масах.

Барацьба партыі вакол пытання аб членстве ў партыі з Мартавым і іншымі апартуністамі мела прынцыповае значэнне, таму што гутарка ішла аб тым, што павінна прадстаўляць сабой партыя рабочага класа — баявы, высокаарганізаваны авангард пралетарыяту або пульхлую арганізацыю мелкабуржуазнага тыпу. Фармуліроўкі Ю. Мартава шырока адкрывалі дзверы ў партыю для няўстойлівых, непралетарскіх элементаў.

Нягледзячы на адчайнае супраціўленне апартуністаў усіх масцей — ад «эканамістаў» да Троцкага, прыцягнуўшых некаторай перавагай галасоў (28 супраць 22) першы параграф Статута ў фармуліроўцы Мартава, цвёрдыя іскраўцы дабіліся таго, што II з'езд прыняў у цэлым праект Статута, прапанаваны У. І. Леніным. У пачатку 1905 года III з'езд партыі прыняў ленінскую фармуліроўку параграфа Статута аб членстве партыі.

У Статуце партыі, прынятым II з'ездам, знайшлі яркае адлюстраванне прынцыпы дэмакратычнага цэнтралізму, якія далі магчымасць усямернаму развіццю актыўнасці членаў партыі, калектыўнае абмеркаванне важнейшых пытанняў у партыйным жыцці. Нармальная дзейнасць партыйных арганізацый і ўсёй партыі ў цэлым, як вучыў У. І. Ленін, магчыма толькі пры строгім захаванні прынцыпу калектывізму кіраўніцтва, якія засцерагаюць партыю ад элементаў выпадковасці і аднабаковасці ў прымаемых рашэннях. Партыя з'яўляецца жывым, самадзейным, развіваючымся арганізмам.

У. І. Ленін упершыню ў гісторыі марксізму распрацаваў вучэнне аб партыі як кіруючай арганізацыі пралетарыяту, як асноўнай зброі ў яго руках, без якой немагчыма заваяваць дыктатуру пралетарыяту, пабудаваць камуністычнае грамадства.

Барацьба У. І. Леніна з апартуністычнымі элементамі на II з'ездзе па праграмных і арганізацыйных пытаннях мела вялікае значэнне. Выкрыццё У. І. Леніна варожых марксізму ідэйных і арганізацыйных установак меншавікоў з'явілася магутным ударам па ўсяму міжнароднаму апартунізму, мела вялікае значэнне для развіцця рэвалюцыйнага руху ва ўсіх краінах. Другі з'езд РСДРП з'явіўся паваротным пунктам у сусветным рабочым руху.

**С. АЖГІРЭЙ,**
**кандыдат гістарычных навук, член КПСС з 1928 года.**

